*Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*

# Беларускі ўніверсітэт

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ
і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

№ 2 (472) | Серада, 17 студзеня 1962 г. | Цана 1 кап.


*11—12 СТУДЗЕНЯ У МІНСКУ АДБЫЛАСЯ НАРАДА РАБОТНІКАЎ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ БЕЛАРУСІ.*

*У РАБОЦЕ НАРАДЫ ПРЫНЯЎ УДЗЕЛ ПЕРШЫ САКРАТАР ЦК КПСС СТАРШЫНЯ САВЕТА МІНІСТРАЎ СССР ТАВАРЫШ М. С. ХРУШЧОЎ, ЯКІ ВЫСТУПІЎ З ВЯЛІКАЙ ЗМЯСТОЎНАЙ ПРАМОВАЙ.*

*З ДАКЛАДАМ «ЗАДАЧЫ РАБОТНІКАЎ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ БЕЛАРУСІ ПА ВЫКАНАННЮ РАШЭННЯЎ XXII З'ЕЗДА КПСС АБ ДАЛЕЙШЫМ РАЗВІЦЦІ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ» ВЫСТУПІЎ ПЕРШЫ САКРАТАР ЦК КАМПАРТЫІ БЕЛАРУСІ К. Т. МАЗУРАЎ.*

* *

# ШЛЯХІ БІЯЛАГІЧНАЙ НАВУКІ І СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ—АДЗІНЫЯ

Закончыла сваю работу **НАРАДА РАБОТНІКАЎ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ БЕЛАРУСІ**. Два дні партыйныя, савецкія работнікі, вучоныя, працаўнікі калгасных палёў разам з Першым сакратаром ЦК КПСС, Старшынёй Савета Міністраў СССР Мікітай Сяргеевічам Хрушчовым абмяркоўвалі пытанні сучаснага стану і далейшага развіцця сельскай гаспадаркі нашай рэспублікі.

Гэта сустрэча адбылася ў знамянальны час! Прайшло толькі нямногім больш двух месяцаў з таго часу, як закончыў сваю работу XXII з'езд Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, які вызначыў канкрэтныя шляхі па будаўніцтву камунізма у нашай краіне. Нарада паказала, з якім энтузіязмам і рашучасцю працаўнікі сельскай гаспадаркі ўзяліся за рэалізацыю рашэнняў з'езда, якіх выдатных поспехаў дасягнулі перадавыя калгасы і саўгасы. Разам з тым, выступаючы ў спрэчках, удзельнікі нарады на яркіх прыкладах аднадушна паказалі, што нашы палі могуць даваць значна лепшыя ураджаі. Для гэтага, перш за ўсё, неабходна рашуча адкінуць убок асуджаную жыццём, нерацыянальную сістэму траваполля і ўзяць кірунак на прапашную сістэму земляробства.

Два дні раіліся ўдзельнікі нарады з М. С. Хрушчовым і шукалі шляхі для далейшага ўздыму сельскай гаспадаркі рэспублікі. Вялікая роля ў гэтай высакароднай справе павінна належыць работнікам сельскагаспадарчай навукі, а тэарэтычную аснову для павышэння прадукцыйнасці сельскагаспадарчай прадукцыі заклікана даць біялагічная навука.

Біёлагам неабходна глыбей пазнаць сутнасць з'яў жыцця на ўсякіх узроўнях, у тым ліку клетачным і малекулярным, глыбей пазнаць таямніцы працэсаў росту і харчавання раслін, неабходна ўзмацніць далейшую распрацоўку мерапрыемстваў, якія забяспечылі-б павышэнне ураджайнасці сельскагаспадарчых культур і павысілі б прадукцыйнасць жывёлаводства. Біёлагі павінны знайсці ключ да разгадкі хвароб раслін і жывёл.

Каб рашыць гэтыя вельмі важныя і актуальныя пытанні, трэба каб удзел у распрацоўцы іх прынялі нашы вучоныя, аспіранты і студэнты. Генецікі ў 1961 годзе атрымалі важныя рэзультаты ў наступных галінах: па вывядзенню гібрыднага насення кукурузы і адбору ўзораў гэтай расліны для ранняй сяўбы ва ўмовах Беларусі, па выяўленню ролі дадатковага апылення на ураджайнасць некаторых культур, па выкарыстанню поліплоідаў гароднінных раслін для стварэння гэтэрозісных гібрыдаў.

Мікрабіёлагі атрымалі ў 1961 годзе устойлівыя штамы азотабактэра, якія могуць быць выкарыстаны для прыгатавання бактэрыяльнага ўгнаення — азотабактэрына.

Фітапатолагі працягваюць распрацоўку мер барацьбы з захворваннямі сельскагаспадарчых культур.

Разам з тым нашы поспехі і недахопы мы павінны вымяраць поўнай меркай — меркай камунізма. Кожны павінен спытаць сябе, ці адпавядае яго работа, яго намаганні іменна такой мерцы, такому ўзроўню кашых задач. Пагэтаму ў святле гэтых патрабаванняў кафедрам біялагічнага факультэта неабходна сканцэнтраваць асноўную ўвагу на ўзмацненне дапамогі сельскагаспадарчай вытворчасці.

Работнікам кафедры фізіялогіі раслін пажадана было б у сувязі з распрацоўкай пытанняў харчавання раслін пачаць работу па вызначэнню мікраэлементаў у глебах, раслінах і водах БССР і прыступіць да картыравання глеб на ўтрыманне мікраэлементаў.

Мікрабіёлагам трэба шырэй разгарнуць работу па вывучэнню мікробных асацыяцый і азотфіксіруючых бактэрый. Гэтыя даследванні паслужаць тэарэтычным абаснаваннем для мінеральных угнаенняў і культывацыі глебы, што з'яўляецца найбольш даступным і эфектыўным сродкам для павышэння яе ўрадлівасці.

Генетыкам трэба шырэй выкарыстаць аддаленную гібрыдызацыю ў селекцыі раслін, асабліва ў атрыманні высокаўрадлівых гібрыдаў кукурузы і гароднінных культур. Улічваючы, што ва ўмовах Беларусі вялікая роля ў павышэнні ўрадлівасці глебы і прадукцыйнасці жывёлаводства належыць люпіну, неабходна значна пашырыць работы па селекцыі гэтай культуры.

Фітапатолагам неабходна павялічыць клопаты па выяўленню мясцовых патогенных і карысных мікраарганізмаў для распрацоўкі комплексных метадаў барацьбы з хваробамі сельскагаспадарчых раслін, удакладніць метады дыягносцікі захворванняў і абаснаваць хіміятэрапію вірусных захворванняў раслін.

Новыя задачы павінны быць пастаўлены і перад работнікамі іншых кафедраў факультэта.

Як паказала нарада, помыслы працаўнікоў сельскай гаспадаркі і вучоных сельскагаспадарчай і біялагічнай навукі аднолькавыя—як мага больш вытвараць прадуктаў для насельніцтва. Нарада яшчэ раз пераканаўча даказала, што ў рэспубліцы ёсць усе магчымасці пераадолець адставанне ў вытворчасці зерня і прадуктаў жывёлаводства, і гэтым самым з гонарам выканаць вялікія задачы, пастаўленыя XXII з'ездам КПСС перад нашым народам.

**П. Г. ПЯТРОВІЧ,**
дацэнт,
дэкан біялагічнага факультэта.

## ІДЗЕ СЕСІЯ...

*У разгары сесія... Для кожнага студэнта яна з'яўляецца сур'ёзным выпрабаваннем, далейшым крокам у жыццё.*

*Вялікае значэнне ў лёсе Мілы Вайтэнка, студэнткі 2-ой групы II курса матэматычнага факультэта, мае цяперашняя сесія. Мінулагоднюю сесію Міла здала нядрэнна, атрымаўшы дзве выдатныя адзнакі і адну добрую. Цяпер Міла дабіваецца новых поспехаў.*

*На здымку вы бачыце, як М. Вайтэнка адказвае на экзамене па матаналізу выкладчыку Ю. С. Багданаву. Патрабавальны экзаменатар паставіў дзяўчыне «добра».*



## ІДЗЕ СЕСІЯ...

*Пакой № 29 займае першае месца па чысціні і парадку ў інтэрнаце № 4. Жыхары гэтага пакою ўключыліся ў барацьбу за права называцца пакоем камуністычнага быту. Яны ўжо заваявалі пераходны вымпел інтэрната.*

*Вось і на здымку вы бачыце студэнтаў 2 курса юрыдычнага факультэта Барыса Марозава і Яўгена Кавалёва за плённай падрыхтоўкай да сесіі.*

Фота *М. Аўсіевіча.*



## ЭКЗАМЕН ПА АНАТОМІІ РАСЛІН

*2 курс біялагічнага факультэта здаў не так даўно экзаменатару дацэнту С. В. Калішэвічу чарговы экзамен па анатоміі раслін.*

*Што можна сказаць аб выніках экзамена?*

*Увогуле, веды, паказаныя студэнтамі-другакуснікамі, нядрэнныя. Амаль кожны трэці студэнт курса атрымаў «выдатна». Ёсць шмат «чацвёрак» і зусім няма нездавальняючых адзнак.*

*А вось рэзультаты іспытаў у другой групе курса. «Выдатна» атрымалі тут В. Аршынава, С. Ахрэм, О. Гаціх, М. Зеневіч, Н. Далматовіч. Маецца 10 добрых і 7 пасрэдных адзнак.*

**Э. ДУНАЕЎСКІ.**

## *НОВЫЯ КНІЖКІ*

Члены кафедры крымінальнага права і працэсу юрфака ў 1961 годзе падрыхтавалі да выдання шэраг навуковых прац.

Хутка будзе закончана работа над кніжкамі «Крымінальны працэс па законадаўству БССР» і «Каментарыраваны крымінальна-працэсуальны кодэкс БССР». Над імі працуюць дацэнты І. І. Мартыновіч, С. П. Бякешка, А. В. Дулаў і іншыя.

## *ПІСЬМО АД ВОІНА*

Я, студэнт-завочнік гістфака П. Сцяфанькін, хачу выразіць праз газету сваю падзяку за праяўленую да мяне чуласць. Справа ў тым, што мне вельмі дапамаглі бібліятэкары БДУ, якія выслалі кнігі па вытокавядзенню гісторыі СССР. Я атрымаў усе тры патрэбныя мне кніжкі. Яшчэ раней, на першым курсе, мне былі высланы ўсе неабходныя падручнікі па старажытнарускай мове.

Напэўна, уважлівыя, чулыя адносіны, увага да запатрабаванняў завочнікаў — сістэма ў рабоце бібліятэкі.

Вельмі прыемна адчуваць гэта і хочацца шчыра падзякаваць работнікам бібліятэкі за тое, што яны працуюць па прынцыпу людзей камуністычнага заўтра: «Чалавек чалавеку — сябра, таварыш і брат».

Сардэчнае дзякуй вам! Да пабачэння, да сустрэчы ў Мінску.

**П. СЦЯФАНЬКІН,**
ваеннаслужачы.

**АД РЭДАКЦЫІ:** Пісьмо П. Сцяфанькіна адлюстроўвае сапраўднае становішча спраў у рабоце бібліятэкі. Высылку і падбор кніг завочнікам па пошце арганізуе бібліятэкар М. А. Жыткевіч. Добрасумленна, чотка працуюць і другія работнікі як на абанеменце, так і на абслугоўванні завочнікаў, своечасова высылаючы патрэбную літаратуру па месцу жыхарства студэнтам-завочнікам.

